ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.08.2023 № 266

**Праграма карэкцыйных заняткаў «Сацыяльна-бытавая арыенціроўка» для I–V класаў вучэбнага плана спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання і выхавання**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная праграма карэкцыйных заняткаў «Сацыяльна-бытавая арыенціроўка» (далей – праграма) прызначана для I–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні.

Вучні з цяжкасцямі ў навучанні (далей – вучні) адчуваюць спецыфічныя цяжкасці ў авалоданні рознымі відамі дзейнасці, уключаючы сацыяльна-бытавую, якія ўскладняюць працэс іх сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі, могуць негатыўна адбіцца на развіцці асобы ў цэлым.

2. Змест дадзенай праграмы не мае рэгламентацыі па часе вывучэння. Колькасць гадзін на вывучэнне вучэбнага матэрыялу вызначаецца педагагічным работнікам на аснове вынікаў педагагічнай дыягностыкі. Педагагічны работнік мае права пераразмяркоўваць колькасць гадзін на вывучэнне раздзелаў, тэм, вучэбнага матэрыялу ўнутры тэмы ў межах гадзін, рэгламентаваных вучэбным планам спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні.

3. Мэта – павышэнне ўзроўню агульнага развіцця, сацыяльна-адаптацыйных магчымасцей вучняў і іх падрыхтоўкі да самастойнай жыццядзейнасці шляхам авалодання асноўнымі сацыяльна-бытавымі кампетэнцыямі.

4. Задачы:

фарміраванне матывацыі да авалодання сацыяльна-бытавой дзейнасцю; пашырэнне межаў узаемадзеяння вучняў з навакольным сацыякультурным асяроддзем;

фарміраванне ўменняў арыентавацца ў сацыяльна-бытавых сітуацыях і заданнях сацыяльна-бытавога плана, планаваць і выконваць дзеянні ў розных сітуацыях, пры выкананні тыповых заданняў; ажыццяўляць кантроль і ацэнку сацыяльна-бытавой дзейнасці;

фарміраванне сацыяльнага вопыту, заснаванага на спрыяльных эмацыянальных перажываннях кожнага вучня;

фарміраванне спосабаў і прыёмаў сацыяльнага ўзаемадзеяння, якія спрыяюць або аблягчаюць працэс актыўнага прыстасавання да ўмоў сацыяльнага асяроддзя;

фарміраванне кампетэнцый: сямейна-бытавой, здароўезберажэння, сацыякультурнай, грамадзянска-прававой, камунікатыўнай.

5. Асноўная арганізацыйная форма навучання – карэкцыйныя заняткі. У залежнасці ад канкрэтных мэтавых установак заняткі могуць дапаўняцца ролевымі гульнямі, асваеннем прышкольнай тэрыторыі, экскурсіямі.

Асноўныя метады: мадэляванне жыццёвых сітуацый, сюжэтна-ролевая гульня, у працэсе якіх вучні выконваюць практычныя дзеянні па распазнаванні небяспечных сітуацый, ухіленні ад небяспекі, ліквідацыі яе наступстваў, замацоўваючы мадэлі паводзін і спосабы дзеянняў па забеспячэнні ўласнай бяспекі.

6. Асноўны патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу выражаюцца ў тым, што ў вучняў будуць сфарміраваны:

уяўленні аб:

прадметах побыту і іх функцыянальным прызначэнні, магчымых экстрэмальных сітуацыях у побыце;

здароўі чалавека і спосабах яго падтрымання;

сям’і, яе функцыях;

сацыяльна-бытавых сітуацыях і спосабах вырашэння практычных бытавых задач;

агульнапрынятых маральных нормах;

традыцыйна-бытавой культуры, нацыянальных святах;

спосабах атрымання інфармацыі сацыяльна-бытавога плана з розных крыніц;

веды аб:

гаспадарча-бытавой працы;

фактарах станоўчага ўплыву здаровага ладу жыцця на агульны стан арганізма;

сацыяльных ролях, узорах сацыяльна нарматыўных паводзін у розных сітуацыях;

бяспецы жыццядзейнасці;

спосабах камунікацыі, культуры зносін;

дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь;

культуры беларускага народа;

уменні:

планаваць і рэалізоўваць сацыяльна-бытавую дзейнасць пры рашэнні практычных бытавых задач;

арыентавацца ў пытаннях здароўезберажэння, бяспекі побыту і выконваць адпаведныя правілы і патрабаванні;

узнаўляць узоры сацыяльна прымальных паводзін у розных сітуацыях у школе, паўсядзенным жыцці;

падбіраць і выкарыстоўваць сродкі зносін адпаведна сітуацыі;

ініцыіраваць і падтрымліваць дыялог сацыяльна-бытавога зместу;

выконваць правілы культуры зносін.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

### Сямейна-бытавая кампетэнцыя

Фарміруемыя ўяўленні аб:

сям'і і яе функцыях;

дамашніх абавязках;

прадметах побыту і іх функцыянальным прызначэнні;

магчымых экстрэмальных сітуацыях у побыце.

Фарміруемыя веды аб:

бытавых электрапрыборах, іх прызначэнні і бяспечным выкарыстанні;

відах гаспадарча-бытавых работ, спосабах і алгарытме іх выканання;

сваіх абавязках у сям'і;

сябрах сям'і і сямейных святах;

патрабаваннях па забеспячэнні пажарнай бяспекі.

Фарміруемыя ўменні:

выконваць правілы і паслядоўнасць уборкі памяшкання;

валодаць асноўнымі спосабамі паўсядзённага догляду за адзеннем і абуткам;

выконваць правілы карыстання кухоннымі прыладамі, посудам, догляду за імі;

выконваць правілы догляду пакаёвых раслін;

удзельнічаць у правядзенні сямейных святаў, умець павіншаваць са святам;

патрабаванні па забеспячэнні пажарнай бяспекі, электрабяспекі.

Практычная работа: знаёмства з правіламі догляду абутку і адзення; распазнаванне розных забруджванняў на адзенні і абутку і іх устараненне; знаёмства з правіламі догляду пакаёвых раслін у практычнай дзейнасці, складанне алгарытмаў паліву раслін, выдалення сухога лісця; выкананне гаспадарча-бытавых работ згодна са складзеным планам (вуснай або пісьмовай інструкцыі), вызначэнне абавязкаў членаў сям'і.

Творчая работа: складанне свайго спіса пакупак з улікам сваіх фінансавых магчымасцей; складанне паведамлення «Як я буду дапамагаць маме (тату) дома» (бытавую сітуацыю выбірае вучань) і прэзентацыя яго ў класе.

### Кампетэнцыя здароўезберажэння

Фарміруемыя ўяўленні аб:

частках цела чалавека;

гігіенічных працэдурах;

распарадку дня;

небяспечных для жыцця і здароўя сітуацый;

небяспечных прыродных з'явах;

прастудных захворваннях;

харчовых атручваннях і іх прычынах;

здаровым харчаванні;

відах і прызначэнні ўстаноў аховы здароўя (паліклініка, бальніца, амбулаторыя).

Фарміруемыя веды аб:

правілах і прадметах асабістай гігіены;

правілах выканання гігіенічных працэдур;

распарадку свайго дня;

прыкметах прастудных і інфекцыйных захворванняў, харчовага атручвання, іх прычынах;

правілах бяспечных паводзін, дзеяннях у сітуацыях, якія пагражаюць жыццю і здароўю;

правілах бяспечных паводзін, дзеяннях у небяспечных сітуацыях.

Фарміруемыя ўменні:

арыентавацца ў будынку цела чалавека;

карыстацца прадметамі гігіены, выконваць ранішні і вячэрні туалет, правілы асабістай гігіены;

выконваць патрабаванні санітарыі і гігіены пры прыёме ежы;

планаваць дзейнасць на працягу дня з улікам распарадку дня;

арыентавацца ў небяспечных прыродных з’явах (навальніца, лівень, галалёд, ураганны вецер і іншае) і выбіраць бяспечны спосаб паводзін пры іх наступе;

арыентавацца ў небяспечных для здароўя сітуацыях: харчовыя атручванні, прастудных, інфекцыйных захворваннях і іншае;

арыентавацца ў небяспечных сітуацыях, звязаных са спробамі ўцягвання ў тытунекурэнне, ужыванне алкаголю і наркатычных рэчываў.

Практычная работа: знаёмства з туалетнымі прыналежнасцямі, падбор сродкаў для ажыццяўлення гігіенічных працэдур, выпрацоўка алгарытму дадзеных працэдур; распазнаванне сімптомаў (на аснове нагляднага матэрыялу) інфекцыйных захворванняў; адпрацоўка алгарытму дзеянняў па прафілактыцы захворванняў і траўматызму; распазнаванне небяспечных сітуацый і вызначэнне бяспечнага спосабу паводзін.

Творчая работа: складанне свайго распарадку дня з апорай на план і пералік наглядных варыянтаў распарадку дня; складанне алгарытму дзеянняў у небяспечнай сітуацыі (сітуацыю вызначае вучань) і прэзентацыя яго ў класе.

### Сацыякультурная кампетэнцыя

Фарміруемыя ўяўленні аб:

членах сям’і, блізкіх сваяках;

тыповых сітуацыях узаемадзеяння членаў сям’і;

сацыяльных ролях;

правілах паводзін у грамадскіх месцах;

традыцыйна-бытавой культуры беларускага народа, нацыянальных святах.

Фарміруемыя веды аб:

сваёй сям’і, сваіх сваяках, сябрах сям’і;

сваіх сямейных абавязках;

правілах сацыяльна прымальных паводзін у розных сітуацыях (у гасцях, транспарце, бібліятэцы, сталовай, магазіне, кінатэатры, тэатры).

Фарміруемыя ўменні:

называць імёны бацькоў, братоў, сясцёр, настаўніка, аднакласнікаў, свой узрост, хатні адрас, нумар школы і класа;

выказваць жэстамі і (або) словамі любоў да сваіх блізкіх (прыцiснуцца, пагладзiць, абняць); выказваць клопат (падаць тапачкі, шалік, прынесці вады);

выконваць правілы сацыяльна прымальных паводзін у розных сітуацыях (у гасцях, бібліятэцы, сталовай, магазіне, кінатэатры, тэатры, транспарце і іншых).

Практычная работа. Знаёмства з сацыяльнымі ролямі, правамі і абавязкамі іх носьбітаў (па карцінках, фатаграфіях, малюнках); знаёмства з абрадамі і святамі, гісторыяй іх узнікнення (па фатаграфіях, відэа), суаднясенне іх з датамі на календары.

Творчая работа. Прадстаўленне сацыяльнай ролі (на выбар) з дапамогай тэатральна-мастацкіх сродкаў, зыходзячы з магчымасцей вучня; падрыхтоўка паведамлення аб нацыянальным свяце або абрадзе (вучань выбірае самастойна) і прэзентацыя яго ў класе; падрыхтоўка малюнкаў на тэму «Маё любімае свята».

Грамадзянска-прававая кампетэнцыя

Фарміруемыя ўяўленні аб:
Рэспубліцы Беларусь;
дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь (Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь);
нормах паводзін;
гістарычным мінулым Рэспублікі Беларусь;
важных падзеях, вядомых людзях сваёй краіны.
Фарміруемыя веды аб:
сацыяльна прымальных паводзінах, адказнасці за правапарушэнні;
важных унутраных падзеях, вядомых людзях Рэспублікі Беларусь;
агульнапрынятых маральных нормах;
правах і абавязках вучня.
Фарміруемыя ўменні:
арыентавацца ў інфармацыі аб гістарычным мінулым і дасягненнях беларускага народа;
суадносіць інфармацыю аб важных унутраных падзеях, вядомых людзях Рэспублікі Беларусь;
арыентавацца ў асноўных бягучых падзеях, якія адбываюцца ў Рэспубліцы Беларусь;
паведамляць аб важных падзеях (вядомых людзях) Рэспублікі Беларусь;
выконваць агульнапрынятыя маральныя нормы і ацэньваць іх выкананне;
выконваць правілы агульнапрынятых сацыяльна прымальных паводзін у розных сітуацыях;
выконваць абавязкі вучня, ацэньваць захаванне правоў і абавязкаў іншымі вучнямі.
Практычная работа. Знаёмства з дзяржаўнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь, правамі і абавязкамі грамадзяніна, агульнапрынятымі маральнымі нормамі паводзін (па карцінках, фатаграфіях, малюнках).
Творчая работа. Падрыхтоўка паведамлення аб важных падзеях (вядомых людзях) Рэспублікі Беларусь (вучань выбірае самастойна), падрыхтоўка малюнкаў, плакатаў; прэзентацыя паведамлення ў класе; прадстаўленне сацыяльнай сітуацыі (выбірае вучань) з мэтай адпрацоўкі навыкаў агульнапрынятых сацыяльна прымальных паводзін.

Камунікатыўная кампетэнцыя

Фарміруемыя ўяўленні аб:
важнасці зносін з акружаючымі людзьмі;
спосабах узаемадзеяння з акружаючымі людзьмі;
крыніцах інфармацыі сацыяльна-бытавога зместу;
номах паводзін у грамадскіх месцах;
культуры зносін.
Фарміруемыя веды аб:
спосабах камунікацыі з акружаючымі людзьмі;
спосабах атрымання інфармацыі сацыяльна-бытавога зместу з розных крыніц;
правілах пабудовы дыялогу, маналагічнага выказвання сацыяльна-бытавога зместу;
сродках зносін;
правілах культуры зносін.

Фарміруемыя ўменні:

ініцыяваць дыялог сацыяльна-бытавога зместу, задаваць пытанні суразмоўцу; уступаць у дыялог сацыяльна-бытавога зместу і падтрымліваць яго;

паведамляць суразмоўцу кароткую інфармацыю сацыяльна-бытавога зместу, у тым ліку атрыманую з розных крыніц інфармацыі (друкаваных, радыё і тэлебачання, глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт, ад іншых людзей), выкарыстоўваючы маналагічнае выказванне;

паведамляць дакладную і кароткую інфармацыю аб экстрэмальных сітуацыях, якія могуць узнікаць у побыце;

падбіраць і выкарыстоўваць сродкі зносін адпаведна сітуацыі;

захоўваць культуру зносін (добразычлівыя адносіны да суразмоўцы, уменне ветліва звярнуцца да суразмоўцы, слухаць суразмоўцу, не перабіваючы яго) і патрабаванні да маўлення для зручных зносін (гучнасць, тэмп).

Практычная работа. Знаёмства са спосабамі камунікацыі, іх выкарыстаннем у працэсе зносін; адпрацоўка алгарытмаў вядзення дыялогу, звароту з просьбай аб аказанні дапамогі, адмовы ад чужой дапамогі; прадстаўленне сітуацыі знаёмства з выкарыстаннем ветлівых фраз і выразаў.

Творчая работа. Складанне паведамлення пра сябе для знаёмства з іншымі людзьмі, прэзентацыя яго ў класе; складанне паведамлення на сацыяльна-значныя тэмы («Ахова прыроды», «Здароўе і спорт», «Мая сям'я», «Мая Радзіма»), стварэнне плаката (малюнка), прэзентацыя яго ў класе; разыгрыванне казак, мультфільмаў, фільмаў з выкарыстаннем тэатральна-мастацкіх сродкаў.

## ЧАКАНЫЯ ВЫНІКІ

У выніку навучання ў вучняў будуць сфарміраваны:

ўяўленні аб:

бытавых прадметах, іх прызначэнні;

хатніх абавязках;

магчымых экстрэмальных сітуацыях у побыце;

частках цела;

гігіенічных працэдурах;

рэжыме дня, планаванні дзейнасці на працягу дня;

небяспечных сітуацыях, спосабах бяспечных паводзін;

прастудных і інфекцыйных захворваннях, харчовых атручэннях і іх прычынах;

шкодзе для здароўя тытунекурэння, ужывання алкаголю і наркатычных рэчываў;

сям'і, яе членах;

сацыяльных ролях;

агульнапрынятых маральных нормах паводзін, каштоўнасцях, установках;

нацыянальных абрадах і святах;

сваёй Радзіме;

спосабах камунікацыі;

крыніцах інфармацыі;

культуры зносін;

веды аб:

відах гаспадарча-бытавых работ, спосабах і алгарытме іх выканання;

бытавых электрапрыборах, іх прызначэнні і бяспечным выкарыстанні;

сваіх абавязках у адносінах да іншых членаў сям'і;

правілах здаровага харчавання;

правілах паводзін у небяспечных сітуацыях («сезонныя небяспекі», харчовыя атручванні, прастудныя і інфекцыйныя захворванні);

нормах паводзін у розных сацыяльных сітуацыях;

правах і абавязках вучня;

дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь (Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь);

сродках зносін, спосабах уступлення і падтрымлівання дыялогу сацыяльна-бытавога зместу;

атрыманні інфармацыі сацыяльна-бытавога плана з розных крыніц (тэлебачанне, друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, глабальная кампутарная сетка Інтэрнэт, і іншыя крыніцы);

правілах пабудовы дыялогу, маналагічнага выказвання сацыяльна-бытавога зместу;

уменні:

выконваць гаспадарча-бытавыя работы (догляд за адзеннем і абуткам; посудам і кухоннымі прыналежнасцямі, падтрыманне парадку ў памяшканні, выкананне бягучай уборкі);

вызначаць і выконваць хатнія абавязкі;

захоўваць патрабаванні па забеспячэнні пажарнай бяспекі і электрабяспекі;

выконваць правілы асабістай гігіены;

арыентавацца ў небяспечных прыродных з’явах (навальніца, лівень, галалёд, ураганны вецер і іншае) і выбіраць бяспечны спосаб паводзін пры іх наступе;

арыентавацца ў небяспечных для здароўя сітуацыях: харчовыя атручванні, прастудных, інфекцыйных захворваннях і іншае;

планаваць дзейнасць на працягу дня з улікам распарадку дня, прытрымлівацца распарадку дня;

захоўваць правілы сацыяльна прымальных паводзін у розных сітуацыях (у гасцях, транспарце, бібліятэцы, сталовай, магазіне, кінатэатры, тэатры і іншых);

выконваць абавязкі вучня, ацэньваць захаванне правоў і абавязкаў іншымі вучнямі пры аналізе розных сітуацый;

арыентавацца ў інфармацыі аб гістарычным мінулым і дасягненнях беларускага народа;

арыентавацца ў асноўных бягучых падзеях, якія адбываюцца ў Рэспубліцы Беларусь;

атрымліваць інфармацыю сацыяльна-бытавога плана з розных крыніц (тэлебачанне, друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, глабальная кампутарная сетка Інтэрнэт, іншыя крыніцы);

падбіраць і выкарыстоўваць розныя формы камунікацыі з акружаючымі людзьмі (дыялог, маналог), арыентавацца ў сітуацыі знаёмства, звяртацца з просьбай;

захоўваць правілы культуры зносін: добразычлівыя адносіны да суразмоўцы, ветлівы зварот, уменне слухаць суразмоўцу.